Панядзелак, 13 Верасень 2021

«Аж да Лукашэнкі будзем пісаць!» Дырэктара прадпрыемства асудзілі на тры гады «хіміі» за «стойку з кулакамі»

Друкаваць (/news/sud/item/4167-azh-da-lukashenki-budzem-pisats?tmpl=component&print=1) | Эл. пошта (/component/mailto/?tmpl=component&template=lt_news&link=c74b7557f831da6153736003a36426afdd930040)

Ацаніць гэты матэрыял (3 галасоў)



(/media/k2/items/cache/d2fb689e74a907951fbcf16d13cc9a19_XL.jpg)

Суд Першамайскага раёну Віцебску прызнаў 50-гадовага дырэктара прыватнага прадпрыемства Міхаіла Захаранку вінаватым у гвалце да супрацоўніка органаў унутраных спраў (арт. 364 КК РБ). Суддзя Наталля Карабліна пастанавіла накіраваць яго на тры гады ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу («хімія»). Супрацоўнікі міліцыі абвінавачвалі мужчыну ў тым, што ён «прыняў стойку са сціснутымі кулакамі» і пагражаў ім ужываннем гвалту.

Па словах сяброўкі **Міхаіла Захаранкі** Наталлі, такога суровага прысуду *«на пустым месцы»* яны не чакалі.

«Мы з ім пасварыліся. Прыехала міліцыя, ён папрасіў іх выйсці за тэрыторыю, чаго яны не зрабілі. І вось… Тое, што ты дакранууся да абмундзіравання – гэта ўжо ўсё! Крымінальны артыкул! Панапісалі там яму ўсяго. У тым ліку – што гэта было грамадскае месца. А гэта ягоны прыватны ўчастак зямлі. Быў яшчэ на судзе нязначны сведка, той, які, нічога не бачыў. Вядома, мы будзем звяртацца ў абласны суд, потым у Вярхоўны і аж да Лукашэнкі будзем пісаць», – паабяцала жанчына.

Рашэнне аб пакаранні прыняла суддзя **Наталля Карабліна**. Прысуд не набыў законнай моцы і можа быць абскарджаны і апратэставаны.

Судовы працэс над мужчынам пачаўся 6 верасня. На першым пасяджэнні (/news/sud/item/4156-sa-stsisnutymi-kulakami) Міхаіл Захаранка часткова прызнаў сябе вінаватым, сказаў, што сапраўды быў нападпітку. Але сцвярджаў, што ніякага гвалту ў дачыненні супрацоўнікаў міліцыі не ўжываў і такога жадання не меў.

Супрацоўнікі міліцыі **Шылаў** і **Пятроўскі** прыехалі ў прыватны дом да Міхаіла па выкліку. У гэты дзень у яго здарыўся канфлікт са сваёй сужыцелькай Наталляй. Пускаць на сваю прыватную тэрыторыю сілавікоў ён не хацеў. Як вынікала з абвінавачання, Захаранка «прыняў стойку са сціснутымі кулакамі» і выказваў пагрозы на адрас супрацоўнікаў. Тым самым нібыта выказваў «намер ужыць да апошніх гвалт, які супрацоўнікі органаў унутраных спраў Шылаў і Пятроўскі ўспрынялі як рэальную пагрозу для свайго жыцця і здароўя».

Уладзімір Бяляўскі

Апублікавана ў Суд (/news/sud)
Тэгі: артыкул 364 КК (/itemlist/tag/артыкул%20364%20КК) міліцыя (/itemlist/tag/міліцыя) Наталья Карабліна (/itemlist/tag/Наталья%20Карабліна)

Яшчэ ў гэтым разьдзеле: « У дачыненні Лукашэнкі ўжыў слова «дэбіл». Вырак: паўтара года калоніі агульнага рэжыму (/news/sud/item/4165-zhykhar-mijorskaga-rajona-atrymau-pautara-goda-kalonii-za-anekdot-pra-lukashenku-i-adno-abrazlivae-slova) Жонку стачкамаўца «Нафтану» Юлію Маліноўскую аштрафавалі на 6670 рублёў. Яна правяла ў ізалятары 5 сутак » (/news/sud/item/4171-ashtrafavali-na-6670-rubljou)

Вярнуцца ў пачатак (/news/sud/item/4167-azh-da-lukashenki-budzem-pisats#startOfPageId4167)

© 2011 - 2023 Віцебская вясна (/). Пры выкарыстаньні матэрыялаў абавязковая гіпэрспасылка. Email: vitebskspring@proton.me (mailto:vitebskspring@proton.me)

(Https(/)/t(/)/w(/)/T(/)/W(/)/B(/)/